# БАГАТЫ СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ

***Як атрымаць зврад пазітыўнай энергіі, адчуць самазадавальненне і знайсці гармонію з навакольным светам, ведаюць людзі, у каго ёсць хобі. Менавіта занятак для душы дапамагае хаця б на некаторы час забыцца пра клопаты і праблемы, супакоіцца і адпачыць ад рэчаіснасці. І сёння мы прапануем даведацца, чым займаюцца ў вольны час старшы выкладчык кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі Наталля КАРПЕНКА і старшы выкладчык кафедры сусветных моў Вікторыя СМІРНОВА.***





**Наталля Карпенка** – выпускніца музычна-мастацкага факультэта нашага ўніверсітэта (сёння – педагагічны факультэт). І яна з цеплынёй і вялікай удзячнасцю ўспамінае заняткі па маляванні з А.М. Кавалеўскім, па жывапісе з А.В. Гумен, па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве з С.І. Балтовічам, па тэорыі і гісторыі мастацтваў з М.Л. Цыбульскім. Цікава, што спачатку пасля заканчэння магістратуры па спецыяльнасці «Мастацтвазнаўства» і аспірантуры па спецыяльнасці «Эстэтыка», Наталля Карпенка працаўладкавалася на кафедру філасофіі, а апошнія чатыры гады працуе на педагагічным факультэце. Можна сказаць – вярнулася да вытокаў.

Яшчэ ў дзяцінстве Наталля Анатольеўна наведвала розныя гурткі, але прафесійны падыход да творчасці з'явіўся толькі ва ўніверсітэце. У альма-матэр Наталля Карпенка асвоіла складаную тэхніку «маркетры» (мазаіка з драўлянага шпону), інкрустацыю саломкай, фларыстыку, вышыўку, шыццё. Работ, створаных падчас навучання ва ўніверсітэце, было шмат, у тым ліку дыпломны праект у тэхніцы «маркетры» – «Успенскі сабор».

Мазаіка з драўлянага шпону – гэта тэхналагічна складаная і фізічна затратная тэхніка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Працаваць з такім прыродным матэрыялам як дрэва складана, бо ў яго асаблівая энергетыка, а розныя пароды маюць свой колер і тэкстуру.

На педагагічным факультэце Наталля Анатольеўна сумяшчае працу і хобі. Так, на занятках па методыцы выяўленчага мастацтва і працоўнага навучання, практыкуме па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве выкладчык з вялікім задавальненнем дзеліцца са студэнтамі сваімі ведамі, а яны натхняюць яе на новыя праекты. Да прыкладу, на педагагічным факультэце ўжо даўно склалася традыцыя віншаваць з Новым годам дзяцей з Віцебскага дома-інтэрната. У якасці падарункаў – лялькі, зробленыя студэнтамі.

А не так даўно моладзь пад кіраўніцтвам Наталлі Карпенка ў рамках супрацоўніцтва з філіялам кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі ДУА «Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці № 2 г.Віцебска» распрацавалі і зрабілі дыдактычную гульню «Свет небяспечных прадметаў» у рамках рэалізацыі праекта «Зялёная школа» для дашкольных устаноў.

Выкладчык не любіць стаяць на месцы. Доўгі час яна займалася інкрустацыяй саломкай, вышывала, рабіла лялькі, захаплялася скрапбукінгам, а цяпер з вялікім задавальненнем працуе з фетрам.

«Знаёмства з новымі тэхнікамі, удасканальванне ўменняў і навыкаў прыводзяць да росту чалавека як асобы», – падагульніла Наталля Анатольеўна.

---

**Вікторыя Смірнова** скончыла Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, на працягу 5 гадоў працуе старшым выкладчыкам кафедры сусветных моў ВДУ. Калі выдаецца некалькі вольных хвілінак, то Вікторыя Мікалаеўна любіць прагуляцца па горадзе, пасядзець ва ўтульнай кавярні, пачытаць добрую кнігу, напрыклад, апавяданні А. Генры на рускай і англійскай мовах. Але самае галоўнае захапленне выкладчыка – бісерапляценне.

Гэтым відам творчасці Вікторыя Смірнова зацікавілася яшчэ ў 12 гадоў. Першапачаткова ў яе творчай скарбонцы былі кулоны, бранзалеты, пярсцёнкі, чахлы, а ў лютым 2020 года з'явіліся яшчэ і брошкі. Самая першая была выканана ў выглядзе вуснаў. Новыя тэхнікі майстар вывучае з дапамогай Youtube.

По словах выкладчыка, каб займацца бісерам, у першую чаргу, трэба быць уседлівым, цярплівым і нацэленым на вынік. Таксама важна атрымліваць асалоду ад працэсу. Так, для Вікторыі Мікалаеўны гэтае хобі дапамагае зняць стрэс, акамуліраваць пазітыўную энергію.



Бісер багаты сваімі формамі, памерамі і прызначэннем. Але выкладчык раіць не губляць час на танныя невысокай якасці матэрыялы, а калі ўжо тэхніка бісерапляцення засвоена, набываць чэшскі або японскі бісер у спецыялізаваных крамах.

Нягледзячы на тое, што выкладчык займаецца бісерапляценнем ужо 17 гадоў, ёй не тое, што не надакучыла, а наадварот – стала яшчэ больш цікава. Шкада толькі, што ёсць не так многа вольнага часу, бо задумак хапае. Напрыклад, зрабіць брошку ў выглядзе фотаапарата для блізкай сяброўкі, якая захапляецца фатаграфіяй. Дарэчы, менавіта блізкія, сябры і знаёмыя, якія з задавальненнем носяць упрыгожванні, зробленыя Вікторыяй Смірновай, просяць яе і надалей займацца бісерапляценнем.



**Эла МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка 3 курса ФГІМК.**